**Білет 23**

**Практычнае заданне.**
**Гаспадарчае развіццё беларускіх зямель у XIV–XVIII стст.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. У якім стагоддзі горад Мінск атрымаў магдэбургскае права?
2. Якія змены ў гарадскім жыцці прадугледжваў дакумент, які ўводзіў магдэбургскае права?
3. Складзіце схему (або «лагічны ланцужок»): “Прычыны і наступствы ўвядзення на беларускіх землях фальваркаў”.
4. Ахарактарызуйце асаблівасці гаспадарчага развіцця беларускіх зямель у XVIII стагоддзі.

**I.**

**З прывілея гораду Менску (1499)**

…Мы, Аляксандр, з Божай ласкі вялікі князь літоўскі, рускі, жамойцкі і іншых [земляў] пан і дзедзіч, даводзім да ведама гэтым нашым лістом… што, жадаючы прымножыць усеагульнае дабро і палепшыць становішча нашага горада Менска, каб нашы людзі, якія там жывуць, дзякуючы добраму і справядліваму ўладкаванню былі заахвочаны, гэты наш горад Менск з права літоўскага і рускага, якое спачатку там было ўстаноўлена, на права нямецкае, так званае магдэбургскае, перакладаем на вечныя часы. Пастанаўляем і даём ім магчымасць, паводле гэтага магдэбургскага права, чыніць поўнае кіраванне і адмяняць усе законы і звычаі, якія магдэбургскае права стрымліваюць, уціскаюць або яму перашкаджаюць…

Жадаем таксама, каб усе жыхары названага горада Менска карысталіся гэтым правам магдэбургскім і ў кожнай справе ва ўсім яго прытрымліваліся. Усіх тых людзей аддаляем ад гарадскога і баярскага права і навечна вызваляем ад суду і ўлады ўсіх ваяводаў, паноў і старостаў, намеснікаў, суддзяў і ўсіх начальнікаў усяго Вялікага Княства Літоўскага такім чынам, што, калі па якой-небудзь справе [жыхары Менска] будуць выкліканыя [апошнімі], яны маюць права не з’яўляцца і не адказваць ім. А калі хто ў чым будзе вінаваты, павінен па справядлівасці ўстаць перад войтам, бурмістрам і радцамі. Калі ж войт або бурмістры вырашаць несправядліва, тады па гэтай справе павінны будуць вызвацца да саміх нас і нам вырашаць, каго якім правам судзіць…

**II. Сельская гаспадарка на беларускіх землях у XVI ст.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі, XVI– XVIII стст. 7 клас»).*

У XV ст. у краінах Заходняй Еўропы хутка рос кошт на зерне. На ўсходзе Еўропы стала выгадна вырошчваць хлеб і прадаваць яго на захад. У сувязі з гэтым феадалы ў ВКЛ сталі ствараць фальваркі - гаспадаркі, у якіх вырошчвалі збожжавыя культуры на продаж.

Першыя фальваркі ўзніклі на захадзе беларускіх зямель, па цячэнні Заходняга Буга і Нёмана. Менавіта па гэтых рэках зручна было сплаўляць зерне на захад, да партовых гарадоў Балтыйскага мора. Да таго ж мясцовая глеба была больш урадлівай.

Фальварак уключаў жылы дом землеўладальніка, розныя гаспадарчыя пабудовы, зямельныя ўгоддзі, і ў першую чаргу раллю. У полі і пры двары працавалі сяляне. Яны маглі выконваць самыя розныя павіннасці, але галоўнай стала адпрацовачная павіннасць - паншчына.

Новая сістэма вядзення гаспадаркі прывяла да значнага ўздыму сельскай гаспадаркі і павышэння яе прыбытковасці. Павялічыліся плошчы пасеваў за кошт распрацоўкі лясоў пад ворыва. Адбыўся пераход да больш дасканалай агратэхнікі, замацавалася трохполле, павысілася ўраджайнасць. Стаў актыўна развівацца ўнутраны гандаль.

Адначасова сяляне былі канчаткова прымацаваныя да сваіх зямельных надзелаў. Згодна са Статутам ВКЛ 1588 г. большасць з іх страцілі асабістую свабоду. Селянін і яго маёмасць прызнаваліся ўласнасцю феадала і падлягалі яго суду. Сялянам забаранялася пакідаць сваю зямлю і ўласніка. З 1588 г. тэрмін пошуку збеглых сялян павялічыўся да 20 гадоў.

## III. Картасхема. Эканоміка Беларусі ў XVIII ст.

